www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

13 красавіка 2006 года, № 8 (1938)

ПАДЗЕЯ

ВЯСНА ПРЫЙШЛА!

30 сакавіка прайшоў конкурс "Міс Вясна-2006", які выявіў самую прыгожую дзяўчыну студгарадка БДУ. Сімвалам гэтай вясны ў галоўным універсітэце краіны стала Людміла Палавінка, студэнтка III курса факультэта журналістыкі.

Тытул "Віцэ-міс" атрымала Ганна Сакадынец. Прыз глядацкіх сімпатый (па выніках Інтэрнэт-галасавання) дастаўся Ірыне Крыванос, сертыфікат на выраб партфоліа быў падораны Алене Лукашовай ("Міс Чароўнасць"). Самыя каштоўныя ўзнагароды, вядома, дасталіся пераможцы: "Міс Вясна" Людміла Палавінка атрымала запрашэнне на вячэру ў рэстаране і падарожжа ў горад каштанаў — Кіеў.

Вось якая яна — "Міс Вясна — 2006" Людміла Палавінка:

Жыццёвае крэда: не нарабі шкоды нікому і ніколі.

Ідэальны мужчына — той, хто заўсёды памятае пра мой дзень нараджэння і ніколі не памятае, колькі мне гадоў.

Мара: зрабіць хаця б аднаго чалавека па-сапраўднаму шчаслівым.

— Твая пастаноўка выглядала так прафесійна! Ты займалася акцёрскім майстэрствам?

— Ніколі. Займалася толькі ў музычнай школе, харэаграфічным ансамблі "Суніčкі" і студыі эстрадных спеваў "Рэзананс".

Люда — і спявачка, і танцорка, і музыкант: грае на акардыёне, фартэпіяна і гітары. За свае 20 год яна шмат чаго пабачыла і паспрабавала, у яе скарбонцы — падарожжы аўтастопам, язда на горных лыжах у Карпатах і шмат іншага.

— У чым сакрэт поспеху на сцэне?

— Гэта нейкае ўнутранае пачуццё. Працаваць з мікрафонам, валодаць аўдыторыяй, трымацца раскавана — усё гэта прыходзіць з вопытам. Але калі няма схільнасці да гэтага, нейкага ўнутранага агеньчыку, жадання падзяліцца сваім цяплом з гледачамі — поспеху не будзе.

Ала МАЧАЛАВА
Фота Юліі ПАПОВАЙ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

САМАСТОЙНАСЦІ НАВУЧЫЦЬ КАМП'ЮТАР
Інфармацыйныя тэхналогіі – у навучальны працэс
Стар. 2

ГАСПАДЫНЯ АЗЁР
Свой юбілей адзначыла прафесар Вольга Піліпаўна ЯКУШКА
Стар. 3

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Дэлегацыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ з 22 сакавіка па 4 красавіка наведала універсітэт горада Трэнта (Італія) у рамках праекта TEMPUS. Падчас візіту дэлегацыя азнаёмілася з арганізацыяй навучальнага працэсу з выкарыстаннем крэдытна-модульнага падыходу да навучання. Адбыліся сустрэчы з рэктарам ВНУ, выкладчыкамі і дэканамі. Дасягнута дамоўленасць пра пашырэнне двухбаковых кантактаў і падрыхтоўку пагадненняў паміж БДУ і універсітэтам Трэнта.

Дэлегацыя БДУ на чале з першым прарэктарам Сяргеем Кімавічам Рахманавым прыняла ўдзел у святкаванні 50-годдзя Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў у г.Дубна Маскоўскай вобласці, з якім БДУ супрацоўнічае шмат гадоў. Падчас візіту адбыліся перамовы пра ўдзел БДУ ў рэалізацыі сумесных праектаў у эканамічнай зоне, створанай у Дубне.

Таксама былі абмеркаваны перспектывы супрацоўніцтва з прадстаўнікамі Нацыянальнай Акадэміі навук Украіны і Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта.

Дэлегацыя БДУ сустрэлася і з калегамі з універсітэта Дружбы народаў. Гаворка ішла пра ўдзел нашага універсітэта ў новым тэхнапарку, які хутка будзе створаны ў гэтай расійскай ВНУ.

Прадстаўнікі БДУ прынялі ўдзел у пасяджэнні Навукова-тэхнічнага савета Нацыянальнага парку "Белавежская пушча". Дасягнута дамоўленасць пра ўзнаўленне супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы. Адзін з новых інавацыйных праектаў — выраб у хлебапякарні Белавежскай пушчы спецыфічных хлебапрадуктаў на аснове натуральных харчовых дабавак, распрацаваных у БДУ.

Навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ была паказана 4—6 красавіка ў Амане, сталіцы Іарданіі, на міжнароднай выставе "Rebuild Iraq — 2006", прысвечанай аднаўленню Ірака. Наш універсітэт прывёз напрацоўкі па такіх напрамках, як нафтапрамысловае абсталяванне, будаўніцтва, сельская гаспадарка, сельгастэхніка, бяспека прадуктаў харчавання, сувязь, медпрэпараты і медтэхніка, абсталяванне і рыштунак для праваахоўных органаў і сіл спецыяльнага прызначэння. У рамках выставы таксама працавалі інфармацыйныя семінары, у якіх дэлегацыя БДУ прыняла чынны ўдзел.

ЮБІЛЕІ

У ГОНАР АКАДЭМІКА СВІРЫДАВА

Мемарыяльная дошка акадэміку НАН Беларусі Вадзіму Свірыдаву была адкрытая 10 красавіка каля ўваходу ў корпус хімічнага факультэта. Цырымонія, у якой узялі ўдзел рэктар БДУ В.Стражаў, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта, прадстаўнікі Акадэміі навук і Міністэрства адукацыі, была прымеркаваная да 75-годдзя з дня нараджэння навукоўца і педагога.

Да юбілею навукоўца прымеркаваная і 4-дзённая III Міжнародная навуковая канферэнцыя "Свірыдаўскія чытанні", якая адкрылася 11 красавіка. У ёй прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты і навукоўцы ў галіне неарганічнай хіміі, нанахіміі, электрахіміі, фізічнай хіміі з універсітэтаў, НДІ і лабараторый Беларусі, Расіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Германіі, Паўднёвай Карэі і ЗША.

Па інфармацыі прэс-службы БДУ
Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ

АФІЦЫЙНА

ПРАЦУЕМ ПА-ГАСПАДАРСКУ

Вынікі фінансава-гаспадарчай дзейнасці універсітэта за 2005 г. абмяркоўваліся на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БДУ, якое адбылося 6 красавіка. З дакладам выступіў саветнік рэктара па эканоміцы і інвестыцыях Уладзімір Спірын. Паводле яго словаў, заданні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця выкананы ў поўным аб'ёме, а па некаторых паказчыках і перавыкананы. На пасяджэнні быў зацверджаны план эканамічнага развіцця універсітэта на 2006 г.

Акрамя таго, рэктар прафесар Васіль Стражаў уручыў ганаровыя граматы Белдзяржуніверсітэта 10 супрацоўнікам і выпускнікам універсітэта, якія прымалі ўдзел у стварэнні Інтэрнэт-сайта Прэзідэнта Беларусі. Ён зачытаў ліст з адміністрацыі кіраўніка дзяржавы, у якім выказвалася падзяка ўдзельнікам праекта.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

АДЗНАЧАНЫ ЛЕПШЫЯ

Урачыстае ўзнагароджанне 12 студэнтаў БДУ, якія сталі стыпендыятамі і лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, адбылося 20 сакавіка ў зале пасяджэнняў Вучонага савета. Стыпендыятамі фонду сталі студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі Андрэй Андрыеўскі (IV курс), фізічнага факультэта — Таццяна Буранкова (V курс), юрыдычнага факультэта — Валерыя Жыгуліч (V курс), факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — Вікторыя Лебедзь (III курс). Лаўрэатамі спецыяльнага фонду сталі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Дзмітрый Дудко, Максім Жыховіч, Валерыя Пірутка (усе IV курс), Сяргей Маркоўскі, Мікіта Селінгер (абодва V курс), Вікторыя Лебедзь (III курс) — усе яны перамаглі ў міжнароднай студэнцкай алімпіядзе па матэматыцы 2005 г. у Благоеўградзе (Балгарыя). У лік лаўрэатаў фонду ўвайшлі таксама студэнты механіка-матэматычнага факультэта Станіслаў Архіпаў (II курс) і Канстанцін Пашковіч (III курс) — яны перамаглі ў Рэспубліканскай студэнцкай алімпіядзе па матэматыцы 2005 г.

Па інфармацыі прэс-службы БДУ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

САМАСТОЙНАСЦІ НАВУЧЫЦЬ КАМП'ЮТАР

На факультэтах прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а таксама радыёфізікі і электронікі адбыліся пашыраныя пасяджэнні рэктарата БДУ, прысвечаныя пытанням выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучальным працэсе. З дакладамі выступілі прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, дэкан ФПМІ Павел Мандрык і загадчык кафедры кібернетыкі ФРФіЭ, дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Юрый Варатніцкі. Дэталёва абмяркоўваліся прыклады разнастайных напрамкаў дзейнасці на ўзроўні кафедраў па інфармацыйнай падтрымцы самастойнай работы студэнтаў. Такія пасяджэнні да канца бягучага навучальнага года пройдуць на геаграфічным і гістарычным факультэтах. Усе чатыры названыя факультэты з'яўляюцца "пілотнымі" ў рэалізацыі універсітэцкай праграмы "Удасканальванне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў (2004—2009 гг.)".

У наступным навучальным годзе выязныя пашыраныя пасяджэнні рэктарата на гэтую ж тэму пройдуць на астатніх факультэтах БДУ.

Удзельнікі абмеркаванняў, якія прайшлі на факультэтах, — госці сённяшняга нумара газеты "Універсітэт".

У мінулым месяцы ў БДУ адбылося адкрыццё агульнауніверсітэцкіх камп'ютарных класаў-медыятэк. Пра сутнасць нововведзення расказвае Павел Аляксеевіч МАНДРЫК, прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:

— Перадусім я хацеў бы нагадаць, што 26 чэрвеня 2004 г. адбылося пасяджэнне Вучонага савета БДУ, на якім была ўхвалена "Стратэгія развіцця Белдзяржуніверсітэта на перыяд да 2011 г." і зацверджана Праграма БДУ "Удасканальванне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў (2004—2009 гг.)". Задача арганізацыі самастойнай, творчай і кантраляванай вучобы студэнтаў на аснове інфармацыйных тэхналогій — адна з асноўных у далейшым развіцці універсітэта. Адкрыццё агульнауніверсітэцкіх класаў-медыятэк будзе спрыяць інтэнсіфікацыі самастойнай работы студэнтаў шляхам стварэння агульнауніверсітэцкай сістэмы інфармацыйнага забеспячэння, што, у сваю чаргу, павысіць якасць правядзення адукацыйнага працэсу ў новых умовах. Пад новымі ўмовамі маецца на ўвазе, што павелічэнне колькасці студэнтаў, якая прыпадае на аднаго выкладчыка, рост аб'ёмаў вывучаемай інфармацыі і ўлік патрэбаў грамадства выклічуць значнае павелічэнне нагрузкі на выкладчыка і на студэнта. Падрыхтавацца да гэтай сітуацыі, не страціць назапашаны досвед магчыма на шляху шырокамаштабнага ўкаранення ў навучальны працэс інфармацыйных тэхналогій.

— Вырашыць такую маштабную задачу нельга без закупкі камп'ютарнай тэхнікі. Што робіцца ў БДУ ў гэтым сэнсе?

— Укараненне інфармацыйных тэхналогій грунтуецца найперш на ўжо наяўных напрацоўках нашага універсітэта. БДУ мае досыць салідныя зачыны ў выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій і дастаткова развітую інфраструктуру інфармацыйнай камп'ютарнай сеткі. У краіне няма аналага такой сеткі ні ў адной ВНУ. Вядома, што БДУ — адзін з найбуйнейшых універсітэтаў Беларусі, і размеркаванне яго на тэрытарыяльна аддаленых пляцоўках з'яўляецца яго асаблівасцю. Аднак у нас створана сетка, якая ахоплівае ўсе падраздзяленні БДУ, ёсць адміністрацыйная палітыка выкарыстання гэтай сеткі. З любога падраздзялення кожны студэнт універсітэта мае магчымасць выйсці ў Інтэрнэт, прычым усё гэта рэгламентавана і даступна. Значыць, укараняць інфармацыйныя тэхналогіі ў навучальны працэс натуральна і неабходна на базе выкарыстання і развіцця магчымасцяў наяўнай інфраструктуры БДУ і яго інфармацыйных рэсурсаў. Пагатоў, што ў апошнія гады ва універсітэце зроблена вельмі шмат у справе насычэння сучаснай камп'ютарнай тэхнікай. Гэта не абмяжоўваецца толькі адкрыццём агульнауніверсітэцкіх медыятэк. Толькі за апошнія паўгода закуплена камп'ютарнай тэхнікі больш чым на 1 млн долараў. Былі набытыя 12 камп'ютарных класаў (агульнай колькасцю 154 камп'ютары), 93 асобныя персанальныя камп'ютары, 485 сучасных ВКВ-маніторaў, 5 высокапрадукцыйных серверaў, 275 тэрмінальных станцый з 11 серверамі, шматлікае сучаснае абсталяванне для сканіравання, капіравання і раздрукоўкі матэрыялаў. Пераважная большасць камп'ютарнай тэхнікі скіравана для забеспячэння ўласна навучальнага працэсу. У бліжэйшы час кожная кафедра універсітэта атрымае дадаткова высокапрадукцыйныя камп'ютар, прынтэр і сканер.

— Вернемся да медыятэк. Якія іх магчымасці?

— Гэтыя класы называюцца медыятэкамі, бо яны аснашчаны сродкамі, неабходнымі для работы з мультымедыйнай інфармацыяй, якая размяшчаецца на разнастайных носьбітах. У кожным з класаў каля 40 сучасных персанальных камп'ютараў. Усе камп'ютары аб'яднаныя ў лакальную сетку, інтэграваную ў карпаратыўную сетку БДУ, і маюць доступ да Інтэрнэту і электронных адукацыйных рэсурсаў факультэтаў універсітэта і Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Так добра аснашчаных камп'ютарных класаў ва універсітэце дагэтуль не было.

Прынцыповым з'яўляецца тое, што гэта агульнауніверсітэцкія класы і работу ў іх арганізуе Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ. Асноўнае прызначэнне агульнауніверсітэцкіх медыятэк — забяспечыць самастойную работу студэнтаў усіх факультэтаў. Студэнт любога факультэта можа ў зручны для яго час папрацаваць у медыятэцы. Рабіць гэта найлепш паводле папярэдняга запісу. Запісацца можна на Інтранэт-серверы БДУ ці пры асабістым прыходзе ў медыятэку. Для доступу ў сетку БДУ і Інтэрнэт выкарыстоўваюцца рэквізіты пластыкавых студэнцкіх білетаў, а ў бліжэйшай будучыні ўлік работы студэнтаў будзе весціся на аснове інфармацыі, запісанай у мікрачып студэнцкага білета.

Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ

Доступ студэнтаў у медыятэкі будзе ажыццяўляцца толькі па пластыкавых студэнцкіх білетах. Якім чынам будуць укараняцца пластыкавыя дакументы з мікрачыпамі ў БДУ, расказвае дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ Юрый Іосіфавіч ВАРАТНІЦКІ:



— Цяпер вядзецца работа па развіцці гэтага праекта ў некалькіх напрамках. Акрамя аўтаматызацыі паслуг у медыятэках, вядзецца работа па стварэнні прапускной сістэмы ў інтэрнатах, навучальных і адміністрацыйных карпусах БДУ. З наступнага навучальнага года праход у інтэрнаты №2 і №6 стане ажыццяўляцца толькі па пластыкавых білетах. Для гэтага на ўваходах у інтэрнаты ўсталююць турнікеты і абсталяванне для счытвання і аналізу інфармацыі. Пропускі ў інтэрнаты будуць скасаваныя, бо інфармацыя пра тое, хто жыве ў інтэрнатах, захоўваецца ў базе даных студэнтаў. Камп'ютарызаваная прапускная сістэма дазволіць спрасціць у дзённы час праход у інтэрнаты студэнтаў БДУ, якія не жывуць там. Адначасова будзе ўведзена прапускная сістэма ў навучальных карпусах хімічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі, адміністрацыйных карпусах рэктарата і бухгалтэрыі.

Плануецца шырокамаштабнае ўкараненне аўтаматызаванай сістэмы абслугоўвання чытачоў у бібліятэцы БДУ, доследная эксплуатацыя якой ужо вялася ў бібліятэчных залах у галоўным корпусе БДУ. Мяркуецца ўстаноўка інфармацыйных кіёскаў у карпусах універсітэта. Студэнты змогуць атрымаць інфармацыю пра расклад заняткаў, кансультацыі выкладчыкаў, запісацца на прыём да кіраўнікоў БДУ, прачытаць сваю электронную пошту і г.д.

— Інфарматызацыя навучальнага працэсу мае на ўвазе не толькі забеспячэнне універсітэта сучаснай камп'ютарнай тэхнікай, але і стварэнне электронных адукацыйных рэсурсаў. Як вядзецца гэтая работа цяпер?

— Электронныя падручнікі і навучальныя дапаможнікі ствараюцца практычна на ўсіх факультэтах і кафедрах універсітэта. Доступ да іх забяспечваецца на ўнутраных і вонкавых серверах факультэтаў і кафедраў. Бібліятэка адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў, створаных на розных кафедрах БДУ, падтрымліваецца аддзелам інфармацыйна-тэхналагічнага забеспячэння навучальнага працэсу Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы і даступная ва ўнутранай сетцы БДУ (па адрасе http://edures.bsu). Найважнейшым электронным рэсурсам з'яўляецца інфармацыйны партал бібліятэкі БДУ (www.library.bsu.by).

Электронныя навучальна-метадычныя комплексы, якія забяспечваюць выкананне студэнтамі заданняў кантраляванай самастойнай работы, размяшчаюцца ў асяроддзі агульнауніверсітэцкай сістэмы e-University.

— Раскажыце падрабязней пра выкарыстанне ў навучальным працэсе універсітэта сістэмы дыстанцыйнага навучання (СДН) e-University. Колькі універсітэт заплаціў за яе распрацоўку?

— У БДУ вядзецца планамерная работа па інфармацыйным забеспячэнні кантраляванай самастойнай работы студэнтаў. Дзеля гэтага ў Цэнтры інфармацыйных тэхналогій БДУ на агульнауніверсітэцкім серверы ўсталяваная СДН e-University, доступ да якой студэнты БДУ маюць па рэквізітах пластыкавых студэнцкіх білетаў. На першым этапе, у бягучым навучальным годзе, у сістэме размяшчаюцца заданні для студэнтаў першага курса гістарычнага, геаграфічнага факультэтаў, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, факультэта радыёфізікі і электронікі. Па выніках выканання кантраляванай самастойнай работы па кожнай дысцыпліне павінна адбывацца выніковае тэсціраванне студэнтаў у асяроддзі e-University. Выніковае тэсціраванне праводзіцца ў агульнауніверсітэцкіх камп'ютарных класах.

Распрацоўка бягучай, трэцяй версіі СДН e-University выканана па тэхнічным заданні, распрацаваным спецыялістамі Цэнтра інфармацыйных тэхналогій і факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. У адпаведнасці з дамовай паміж БДУ і кампаніяй ІВА распрацоўка выканана на бясплатнай аснове. Дапрацоўка і мадэрнізацыя сістэмы таксама выконваюцца ІВА бясплатна. Пры гэтым права ўласнасці на сістэму належыць ІВА, а на размешчаныя на ёй навучальныя матэрыялы — БДУ.

ПАМЯТКА СТУДЭНТУ

У адпаведнасці з загадам рэктара №32-ОД ад 02.02.06 у структуры Цэнтра інфармацыйных тэхналогій створаныя тры агульнауніверсітэцкія медыятэкі:

№1 — у корпусе геаграфічнага факультэта (вул. Ленінградская, 16, пакой 114);

№2 — у корпусе факультэта радыёфізікі і электронікі (вул. Курчатава, 5, пакой 211);

№3 — у корпусе БДУ па вул. Рэвалюцыйнай, 11 (пакой 203).

Ва універсітэце адбылося афіцыйнае адкрыццё медыятэк №1 і №2. Адкрыццё медыятэкі №3 плануецца на бліжэйшы час, пасля заканчэння рамонту ў памяшканні, вылучаным пад медыятэку. У будучым плануецца адкрыць мэдыятэкі ў будынку па вул. Кальварыйскай і ў новым корпусе факультэта міжнародных адносін, якія цяпер будуюцца.

Медыятэкі — гэта агульнауніверсітэцкія камп'ютарныя класы на 33, 39 і 35 працоўных месцаў, прызначаныя для самастойнай работы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Медыятэкі інтэграваныя ў карпаратыўную сетку БДУ, г.зн. у іх даступныя ўсе рэсурсы сеткі БДУ: навучальныя матэрыялы факультэтаў, сістэма e-University, бібліятэчныя рэсурсы і Інтэрнэт. Пералік усталяванага ў медыятэках сістэмнага і інструментальнага праграмнага забеспячэння і магчымасці яго дапаўнення ўказваюцца на Інтранэт-сайце (http://intranet.bsu). Кожны камп'ютар аснашчаны навушнікамі, мікрафонам, прыладай чытання DVD-дыскаў і USB-партамі. Палова камп'ютараў мае прылады запісу на дыскі CD і DVD, USB-кошыкі для работы з уласнымі хард-дыскамі, прылады для чытання картаў памяці. У кожнай медыятэцы ёсць высокахуткасны сканер. Усе гэтыя рэсурсы даступныя для самастойнай працы карыстальнікаў медыятэк. Такім чынам, студэнт можа адсканіраваць неабходныя яму матэрыялы і фотаздымкі, счытаць інфармацыю з карты свайго лічбавага фотаапарата, флэш-дыска альбо хард-дыска. Неабходная інфармацыя можа быць запісана на любую прыладу: CD альбо DVD-дыск, флэш-дыск альбо хард-дыск. Акрамя таго, у кожнай медыятэцы ўсталяваны шматфункцыянальны сеткавы апарат (прынтэр, сканер, капір).

Працаваць можна ў любой з медыятэк. Адзіная абавязковая ўмова — наяўнасць імя карыстальніка (Login), зарэгістраванага ў сетцы БДУ. Для студэнтаў імя карыстальніка ўказана на пластыкавым студэнцкім білеце.

У сетцы БДУ існуе ўнутраны агульнауніверсітэцкі сайт (http://intranet.bsu), на якім службы універсітэта публікуюць аператыўную інфармацыю і разнастайныя дакументы, неабходныя ў тым ліку і студэнтам. У прыватнасці, на сайце апублікавана і інфармацыя пра медыятэкі, уключаючы beta-версію праграмы рэзервавання месцаў у медыятэцы. На сайце ў раздзеле "выхад у Інтэрнэт для студэнтаў" апісваюцца тэхналогіі выкарыстання імёнаў карыстальнікаў і пароляў для студэнтаў у карпаратыўнай сетцы БДУ. Звяртаем увагу, што пры рэгістрацыі імя карыстальніка для студэнтаў пароль не задаецца. Студэнт самастойна павінен усталяваць пароль праз раздзел "выхад у Інтэрнэт для студэнтаў", прычым зрабіць гэта трэба адразу пасля атрымання білета, каб гэтым імем не карысталіся іншыя.

Медыятэкі працуюць у дзве змены (да 21.00), а таксама ў суботу (да 19.00). Больш падрабязны графік працы і іншую неабходную інфармацыю пра медыятэкі і карпаратыўную сетку БДУ чытайце на сайце INTRANET.BSU.

АСОБЫ

ГАСПАДЫНЯ АЗЁР

Сёлета свой 85-гадовы юбілей адзначае не толькі наш універсітэт. Гэты год адметны святочнай датай і для супрацоўніцы БДУ прафесара Вольгі Якушка. Навукоўца-фізікагеограф, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, абаяльная жанчына ў сакавіку адзначыла свой юбілей: год яе нараджэння супадае з годам заснавання БДУ.

Вольга Піліпаўна — найстарэйшы прафесар універсітэта. Навуковая грамадскасць ведае яе як заснавальніцу беларускай школы лімналогіі, аўтара больш за 300 работ, у тым ліку падручнікаў для школаў і ВНУ, навукова-папулярных кніг па прыродзе Беларусі.

Нарадзілася В. Якушка 18 сакавіка 1921 г. у Мінску. Яе бацька, інжынер-будаўнік, не толькі ўдзельнічаў ва ўсіх буйных беларускіх будоўлях першай пяцігодкі, але і быў галоўным інжынерам першых карпусоў БДУ. Пасля заканчэння школы В. Якушка ў 1938 г. паступіла на геолага-геаграфічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, і ўсё яе далейшае жыццё стала непарыўна звязана менавіта з універсітэтам.

“1 чэрвеня 1941 г. пасля здачы іспытаў III курса наша група адправілася на вучэбную практыку на Каўказ. Кожны дзень там быў напоўнены новымі ўражаннямі і маленькімі адкрыццямі. Група паехала дадому 21 чэрвеня, а я засталася на невялікі адпачынак у Сочы. Раніца прынесла страшную вестку пра вайну, пра бамбёжкі Кіева, Брэста, Мінска”, — згадвае Вольга Піліпаўна. Вайну яна прабыла ў эвакуацыі — спярша ў Кургане на Урале, потым пад Куйбышавам, дзе апынуўся яе бацька. У Куйбышаве яна працавала на авіязаводзе №1 па стварэнні ваенных самалётаў.

Выпадкова, з абрыўка газеты ў лістападзе 1943 г. В. Якушка даведалася, што на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў сваю дзейнасць Белдзяржуніверсітэт. “Мяне адпусцілі на вучобу, хоць гэта было не проста. У Маскве я ўладкавалася ў далёкіх сваякоў і кожны дзень ездзіла на прыгарадным цягніку (электрычак тады не было) у далёкі пасёлак Сходня”. Пра цяжкія ваенныя гады Вольга Піліпаўна згадвае з асаблівай цеплынёй і пяшчотай: “Універсітэту пастаянна дапамагаў Маскоўскі універсітэт, нейкія добрыя арганізацыі “падкідвалі” штосьці з вопраткі, а аднаго разу падарылі вялікі мех жытняй мукі (без картак!). Тады на абед нам даставалася цэлая міска цудоўнай іржаной заціркі”.

Пасля вызвалення Мінска ад фашыстаў Вольга Піліпаўна працавала на аднаўленні універсітэта. У 1945 г. закончыла геаграфічны факультэт, а ў 1948 г. — аспірантуру: “Увесну 1945 г. я закончыла геафак і атрымала запрашэнне паступаць у аспірантуру, на што я з радасцю пагадзілася. Вучыцца мне было даволі цяжка: збіраць матэрыялы даводзілася пешшу — транспартных зносінаў з навакольлем практычна не было. Але тут значную дапамогу мне зрабіў мой кіраўнік В.А. Дзяменцьеў. Ён не толькі змог “выбіць” для мяне імянную стыпендыю, але і прайшоў са мной шэраг маршрутаў”.

Працавала выкладчыцай кафедры фізічнай геаграфіі, а пасля абароны кандыдацкай дысертацыі (1949) — дацэнтам гэтай самай кафедры. “З 1955 г. я пачала займацца азёрамі Беларусі. Атрымалася гэта выпадкова: аднойчы накіравалася на возера Доўгае — самае глыбокае возера Беларусі, якое мяне вельмі ўразіла. Працаваць даводзілася вельмі шмат. Аднак са студэнтамі ніякіх непаразуменняў не было, я з імі сябравала”, — згадвае юбілярка.

У 1969 г. В. Якушка абараніла доктарскую дысертацыю на тэму “Гісторыя развіцця і сучасны стан азёр поўначы Беларусі”. У 1973 г. яна арганізавала і ўзначаліла кафедру агульнага землязнаўства, і ў тым самым годзе з ініцыятывы В. Якушка на факультэце была створаная галіновая навукова-даследчая лабараторыя возеразнаўства, якая набыла шырокую вядомасць у навуковым свеце не толькі Беларусі, але і па-за яе межамі. Навукоўца параўноўвае тую эпоху з сённяшняй: “У 60-я мы працавалі над многімі тэмамі, якія да таго не распрацоўваліся. Таму хоць мы і былі першымі, але нам было прасцей, чым сённяшнім даследчыкам: занадта многа тэмаў нехта распрацоўваў да іх”.

Сваёй першай сур’ёзнай кнігай Вольга Піліпаўна лічыць манаграфію “Беларускае Паазер’е. Гісторыя развіцця і сучасны стан азёр Беларусі” (1971). Вывучэннем азёраў В. Якушка займалася настолькі плённа, што менавіта пад яе кіраўніцтвам і пры яе непасрэдным удзеле на пачатку 80-х з’явіўся першы даведнік “Азёры Беларусі”.

Асаблівы гонар для В. Якушкі — сям’я. Яе дочкі пайшлі па слядах бацькоў: заняліся навукай, атрымалі кандыдацкія ступені.

Равесніца універсітэта і сёння займае актыўную жыццёвую пазіцыю, працягвае разважаць пра ролю навучання ў жыцці чалавека: “Я б вельмі хацела, каб мае ўяўленні пра ролю і значэнне разумнага, адукаванага добрага чалавека ў сучасным складаным свеце пакінулі свой след у галовах і сэрцах географаў будучых пакаленняў”. У яе і дагэтуль вельмі сяброўскія адносіны са студэнтамі: Вольга Піліпаўна лічыць, што гэта для яе — найлепшы падарунак да юбілею.

Падрыхтавала Ірына ШЫК

ГОСЦІ

ЭБЕРХАРД ГІРЛІХ — ГАНАРОВЫ ДОКТАР БДУ

Прафесар Магдэбургскага універсітэта (Германія) Эберхард Гірліх атрымаў званне ганаровага доктара БДУ. Ён супрацоўнічае з нашым універсітэтам ужо многія гады. Эберхард Гірліх ініцыятар і кіраўнік некалькіх буйных навуковых сумесных праектаў, у тым ліку з механіка-матэматычным факультэтам па падрыхтоўцы студэнтаў па спецыяльнасці “камп’ютарная матэматыка”.

Прафесар Гірліх спрыяў узаемным навуковым кантактам, арганізоўваў стажыроўкі для беларускіх навукоўцаў-матэматыкаў. Пад яго кіраўніцтвам тры спецыялісты з БДУ абаранілі дысертацыі ў Германіі. Сумесныя навуковыя публікацыі Э. Гірліх мае з 14 беларускімі навукоўцамі. Разам з нашымі матэматыкамі ён падрыхтаваў больш за паўсотні дакладаў на міжнародных канферэнцыях.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

МУЗЕЙ — У ПАДАРУНАК

Адным з падарункаў да 85-гадовага юбілею БДУ стане адкрыццё адноўленага Музея гісторыі універсітэта.

Праца па складанні новай музейнай экспазіцыі пачалася яшчэ ў канцы 2005 г., а вось мастакоў для гэтага знайшлі толькі нядаўна. У конкурсе, дзе прымалі ўдзел як арганізацыі, якія займаюцца афармленнем музеяў, так і асобныя мастакі, пераможцам стала РУП “Цэнтр музеязнаўчых, афарміцельскіх і даследчых работ”.

Памяшканне, дзе размесціцца музей, цяпер рыхтуецца да сур’ёзнага рамонту. У ім размесціцца не толькі стандартная экспазіцыя, якая распавядзе пра гісторыю БДУ, але і невялікая кіназала, дзе плануецца паказваць тэматычныя ролікі, прэзентацыі і г.д., звязаныя з дзейнасцю як універсітэта ў цэлым, так і асобных яго факультэтаў і розных падраздзяленняў. У экспазіцыі можна будзе ўбачыць старыя дакументы і фотаздымкі з гісторыі БДУ, знойдзеныя супрацоўнікамі Музея гісторыі БДУ і кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва гістарычнага факультэта. Пошук матэрыялаў па гісторыі БДУ ад пачатку 90-х да сённяшніх дзён яшчэ працягваецца, і мы будзем удзячныя ўсім, хто дапаможа ў іх падборы.

Антаніна ПІШЧАЛЬНІКАВА, загадчыца Музея гісторыі БДУ

Адкрыццё ў БДУ класаў-медыятэк стала падзеяй не толькі для студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта. Шырока пра гэта паведамлялі айчынныя мас-медыя: **“В БГУ появились классы медиатеки”** (“Рэспубліка”, 11.03.2006); **“Медиатеки в БГУ”** (“Вечерний Минск”, 14.03.2006); **“Медыятэкі для самакантролю студэнтаў”** (“Настаўніцкая газета”, 23.03.2006).

Дни открытых дверей в БГУ, порядок приема и репетиционного тестирования – гэтым падзеям прысвяцілі свае Інтэрнэт-старонкі інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, tut.by, news.by, naviny.by, а таксама газеты “Рэспубліка”(28.03.2006), “Звязда” (18.03.і 25.03.2006), “Гродненская правда”(11.03.2006), “Знамя юности” (24.03.2006), “Настаўніцкая газета” (14.03.і 30.03.2006), “Минский курьер” (21.03.і 24.03.2006),

“Золотая дюжина Белгосуниверситета” (“Рэспубліка”, 22.03.2006), **“Специальные награды”** (”Знамя юности”, 24.03.2006), **“Двенадцать раз сказать “Победа!”** (“Народная газета” 22.03.2006) — назвы артыкулаў пра ўрачыстасці, якія адбыліся ў БДУ з нагоды ўручэння ўзнагарод спецыяльнага фонду прэзідэнта краіны па падтрымцы таленавітай моладзі студэнтам Белдзяржуніверсітэта. Інфармацыя пра гэта размешчана і ў “Вечернем Минске” (21.03.2006).

Матэрыял з нагоды юбілею выдатнага навукоўца і выкладчыка БДУ Вольгі Якушка надрукаваны ў “Настаўніцкай газеце” (25.03.2006), а ў штотыднёвіку “7 дней” (30.03.2006) у рубрыцы “Персона” пададзена інтэрв’ю з вядомым журналістам, прафесарам, доктарам філалагічных навук Барысам Стральцовым.

“Настаўніцкая газета” ў нумары за 25.03.2006 расказвае пра тое, як ствараўся падручнік “Беларуская літаратура. 6 клас”. Героямі матэрыялу сталі аўтары гэтага і іншых выданняў для навучэнцаў 5-х і 6-х класаў, у тым ліку прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры філфака БДУ Алесь Бельскі. А 30.03.2006 у гэтай жа газеце змешчана інтэрв’ю з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым, прысвечанае перспектывам развіцця нашага універсітэта. Гутарка з рэктарам **“Где грызть гранит науки сладко...”**, прысвечаная сувязям нашага універсітэта з расійскімі ВНУ, надрукавана ў газеце “Советская Белоруссия”(06.04.2006).

Адна з апошніх падзей, якая святочна і весела прайшла ў БДУ, — конкурс прыгажосці “Міс Вясна — 2006”. Пра гэта ў сваіх матэрыялах **“Вясна” абрана!”** і **“Как в БГУ встречали весну”** расказалі журналісты “Звязды”(04.04.2006) і “Вечернего Минска” (03.04.2006).

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ

АБ’ЯВЫ

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ біяхіміі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: псіхалогіі, менеджменту;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і інфарматыкі, фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, ядзернай фізікі, неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, біяхіміі, заалогіі, вышэйшай алгебры, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, лікавых метадаў і праграміравання, батанікі, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, геаграфічнай экалогіі, філасофіі культуры, філасофіі і метадалогіі навукі, псіхалогіі, гісторыі новага і найноўшага часу, гісторыі Расіі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, крыніцазнаўства, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, тэлебачання і радыёвяшчання, сацыяльна-гуманітарных навук, канстытуцыйнага права, гісторыі беларускай літаратуры, славянскіх літаратур, сучаснай беларускай мовы, замежнай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, сучаснай беларускай мовы, тэорыі літаратуры;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і інфарматыкі, энергафізікі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, вышэйшай алгебры, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, фізіялогіі чалавека і жывёл, заалогіі, батанікі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, раманскіх моў, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, грамадскага здароўя і аховы здароўя, раманскіх моў, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: сацыяльнай камунікацыі, псіхалогіі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, раманскіх моў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, батанікі.

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул.Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:

дацэнта кафедры рэабіліталогіі.

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ”

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

выкладчыка кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін;

старшага выкладчыка кафедры прыродазнаўчых дысцыплін.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб’явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Камсамольская, 21, аддзел кадраў, тэл. 229-29-46.

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

● 13—19 красавіка ў інтэрнатах БДУ пройдуць справаздачна-выбарныя канферэнцыі студэнцкіх саветаў інтэрнатаў.

● У рамках праграмы II тура спартакіяды студэнцкага гарадка БДУ з 10 красавіка пачаліся спаборніцтвы па валейболе, якія адбудуцца ў спартыўнай зале факультэта радыёфізікі і электронікі. 13 красавіка ў спартыўным комплексе “Буравеснік” пачнуцца спаборніцтвы па міні-футболе.

Паводле паведамлення прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

13 красавіка 2006 года, № 8 (1938)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

Па выніках першага квартала ў БДУ выдадзена 81 кніга агульным аб'ёмам 507,18 улікова-выдавецкіх аркушаў. Падпісана да друку 59 арыгіналаў-макетаў вучэбных, даведачных і навуковых выданняў. 7 навучальных дапаможнікаў атрымалі грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Г.А. Пицевич, М.Б. Шундалов. **Молекулярная спектроскопия.** У практыкуме для студэнтаў фізічнага факультэта прыводзяцца лабараторныя работы і заданні па рэгістрацыі, інтэрпрэтацыі і мадэляванні электронных, хістальных, вярчальных і тарсіённых спектраў малекул.

Программы для студентов-иностранцев специальности 1-21 05 02 "Русская филология". Праграмы адрасуюцца студэнтам-замежнікам, якія вывучаюць рускую мову ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Немецко-русский словарь банковско-финансовых терминов. Нямецка-рускі слоўнік тэрмінаў з банкаўскай, крэдытнай і фінансавай сферы прызначаецца студэнтам эканамічных спецыяльнасцей.

Considering issues = Дискуссия. У дапаможнік увайшлі скрыпты з аўтэнтычных англамоўных радыёінтэрв'ю, газетныя артыкулы і рэклама па найбольш актуальных тэмах. Да моўнага матэрыялу дадаецца серыя практыкаванняў для развіцця навыкаў спантаннага маўлення, а таксама распрацаваныя заданні для правядзення дыскусій.

Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора. У зборніку навуковых артыкулаў падаецца гісторыя развіцця розных відаў крытыкі: літаратурнай, тэатральнай, мастацкай, музычнай.

А.Н. Кононов, А.Н. Денисов. **Система понятий в психологии воинской деятельности.** Навучальны дапаможнік для студэнтаў (курсантаў) ваеннага факультэта ўключае паняцці і тэрміны, якія найбольш часта ўжываюцца ў вайсковай псіхалагічнай і педагагічнай літаратуры.

Контрольные работы по русскому языку. Кантрольныя работы накіраваны на сістэмнае паўтарэнне школьнага курса рускай мовы.

Ноумен. Выпуск 4. У зборніку навуковых работ маладых навукоўцаў і аспірантаў факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ аналізуюцца актуальныя праблемы сацыяльнай філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі і тэорыі камунікацыі, пытанні метадалогіі гуманітарнага пазнання.

А.А. Килбас. **Интегральные уравнения.** Курс лекцый напісаны ў адпаведнасці з праграмай для універсітэтаў па спецыяльнасці "Механіка", мае сцісла гістарычны нарыс развіцця тэорыі інтэгральных ураўненняў, асноўныя паняцці і тэарэмы тэорыі інтэгральных ураўненняў.

Биохимия. Практыкум змяшчае лабараторныя работы па метадах якаснага і колькаснага аналізу асноўных відаў біямалекул: амінакіслоты, бялкі, ферменты, нуклеатыды, вугляводы, ліпіды, вітаміны.

В.В. Сенчук. **Биохимия. В двух частях. Часть 1. Биомолекулы.** Першая частка курса лекцый прысвячаецца выкладанню асноў біяхіміі ў адносінах да найважнейшых біямалекул — прыродных арганічных злучэнняў, арганізацыя і функцыянаванне якіх ляжыць у аснове працэсаў жыццядзейнасці.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

СМАЧНА ЕСЦІ!

На юрыдычным факультэце 4 красавіка адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця буфета. У ёй прынялі ўдзел кіраўніцтва БДУ, юрфака, студэнты. Цяпер будынак юрфака, які, дарэчы, адчыніў свае дзверы 1 верасня мінулага года, мае ўтульнае памяшканне, дзе можна смачна і нядорага падсілкавацца.

Фота Сняжаны ЛІСОЎСКАЙ

СРЭБРА ЗА ПРАВА

Каманда факультэта міжнародных адносін (у складзе Аляксандры Кучмінскай, Дзяніса Ільянкова, Наталлі Байбарошы) заняла другое месца ў Першым нацыянальным спаборніцтве па міжнародным праве сярод студэнтаў юрыдычных факультэтаў і ВНУ Беларусі.

У спаборніцтве, якое прайшло 2—5 красавіка на базе факультэта міжнародных адносін БДУ, удзельнічалі каманды Віцебскага, Гродзенскага, Гомельскага універсітэтаў, Беларускага інстытута правазнаўства, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін. Наш універсітэт прадстаўлялі каманды з ФМА і юрфака.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ЖУРНАЛІСТАМ — ПРА БАКСТА

Навуковыя чытанні, прысвечаныя 140-годдзю са дня нараджэння вядомага мастака, заканадаўца мод, майстра тэатральных дэкарацый, дэкаратара і стыліста Льва Бакста, адбыліся на факультэце журналістыкі 30 сакавіка.

Такія мерапрыемствы праходзяць на журфаку не першы год: студэнты ўжо мелі магчымасць паглыбіцца ў таямніцы іканапісі, пазнаёміцца з творчасцю Сальвадора Далі, Клода Манэ, Марка Шагала і іншых вядомых творцаў.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

УШАНАВАЛІ ЧЫЖЭЎСКАГА

Міжнародны навуковы семінар, прысвечаны навуковай спадчыне расійскага навукоўца, пачынальніка касмічнага прыродазнаўства Аляксандра Чыжэўскага, прайшоў 25 сакавіка на фізічным факультэце. З дакладамі выступілі навукоўцы не толькі нашага універсітэта, але і Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, Таўрычаскага універсітэта (Сімферопаль), Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Акрамя таго, у Літаратурным музеі Янкі Купалы адкрылася выстава "А.Л. Чыжэўскі — навуковец, мастак, паэт", арганізаваная Калужскім навукова-мемарыяльным і культурным цэнтрам А.Чыжэўскага.

КАНЦЭРТ ДЛЯ ВЫДАТНІКАЎ

"Дзень выдатніка" адбыўся 22 сакавіка на геаграфічным факультэце. Па традыцыі на гэтае свята, якое заўжды адзначаецца ў дзень веснавога раўнадзенства, запрашаюцца тыя, хто паспяхова вучыўся на геафаку і закончыў яго на "пяцёркі": іх павіншаваў дэкан факультэта прафесар, доктар геаграфічных навук Іван Пірожнік. Выдатнікі атрымалі падарункі ад пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ. Гасцей прывіталі таксама галоўны рэдактар выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" Генадзь Пашкоў і дуэт "Аляксандра і Канстанцін".

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ДЗЕНЬ ПАЭЗІІ ДЛЯ МАЦІ

На юрыдычным факультэце адбыўся Дзень паэзіі. Сёлета ён прысвячаўся Году Маці.

Студэнты чыталі вершы, спявалі, выступалі з танцавальнымі нумарамі. Спонсарам мерапрыемства выступіў юрыдычны факультэт: кожны ўдзельнік атрымаў памятны сувенір — кнігу. Акрамя таго, артыстаў чакаюць грашовыя прэміі ад дэканатаў.

Такія святы праводзяцца на факультэце ўжо больш за 20 гадоў, і ўжо шосты раз яны ладзяцца з дапамогай Саюза жанчын БДУ.

В.С. БРАНАВЕЦ,
старшыня Саюза жанчын юрыдычнага факультэта

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІКТАРЫНА ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю сумесна з гістарычным факультэтам праводзяць ужо традыцыйную віктарыну сярод студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў БДУ, прысвечаную Дню Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Конкурс адбываецца ў адзін этап. Вашы адказы на пытанні прымаюцца з 17 красавіка 2006 г. да 12 мая 2006 г. ва ўпраўленні выхаваўчай работы з моладдзю (галоўны корпус, пакой 207 з 8.30 да 17.15, тэл. для даведак 209-50-59). Ацэньваецца правільнасць і паўната адказаў, афармленне. Пераможцаў чакаюць прэміі: I месца — 350 тыс. руб., II месца — 250 тыс. руб., III месца — 150 тыс. руб.

Пытанні да віктарыны

1. Закончыце верш. Назавіце аўтара і назву верша. Якім падзеям ён прысвечаны?

Злосна сказаў: "Уставай, пяхота!
Ты не на пляжы, а на вайне"...

2. Устаўце прапушчаныя слова ва ўспаміны былога партызана, вядомага беларускага пісьменніка А. Адамовіча: "Як самазабыўна хлусілі мы, партызаны, сабе і няшчасным бабам, калгаснікам, якіх фашысты палілі, забівалі за дапамогу нам, партызанам: затое ... ужо не будзе! І ўсё будзе не так, як да вайны! А людзям так крыўдна было паміраць за гэтыя самыя ...".

3. Абароне якога беларускага горада К. Сіманаў прысвяціў свой раман "Жывыя і мёртвыя"? Чаму?

4. Каму належаць словы, сказаныя ў кастрычніку 1941 г.: "Давайце не будзем гаварыць пра цёмныя дні, давайце лепш гаварыць пра суровыя дні. Дні не цёмныя, яны — вялікія, самыя вялікія дні, якія толькі перажывала наша краіна, і мы ўсе павінны дзякаваць Госпаду, што нам дазволена — кожнаму на сваім месцы — быць часткай народа, які творыць гэтыя дні, незабыўныя дні ў гісторыі нашай расы"?

5. Чаму ў "трохкутніку" Гродна—Ваўкавыск—Беласток не зарэгістравана ніводнай карнай аперацыі нацыстаў за гады акупацыі?

6. Хто і пра якую аперацыю дакладваў наступныя звесткі: "Забіта працаўніка — 4500, ... узята ў палон — 250, знішчана лагераў працаўніка — 57, знішчана бункераў працаўніка — 261, ... затоплена вялікіх лодак — 4, затоплена плытоў — 22. Трафеі — 1 самалёт, 12 буксірных лодак, 10 гармат калібру 150 мм, 2 гарматы, 9 гранатамётаў, 51 кулямёт, 492 вінтоўкі, 31300 — патронаў і 1200 кг выбуховага рэчыва..."?

7. У верасні 1941 г. І.В. Сталін паслаў у блакадны Ленінград пачак сваёй улюбёнай табакі "Герцагавіна Флёр" з запіскай: "...Цяпер уся надзея толькі на цябе...". Каму прызначаўся падарунак? Што азначаюць словы ў запісцы?

8. Пра каго ідзе гаворка: "У 1941 г. — найстарэйшы прафесар гістарычнага факультэта БДУ, акадэмік АН БССР, член-карэспандэнт АН СССР. Застаўся ў акупаваным Мінску, 1 жніўня 1943 г. выведзены партызанамі ў размяшчэнне брыгады "За Савецкую Беларусь".

9. Тэкст гэтай песні быў напісаны настаўнікам рускай мовы А. Бадэ, але вядомасць яна атрымала толькі праз 20 гадоў пад аўтарствам іншага паэта. Назавіце назву песні і яе аўтараў.

10. Што аб'ядноўвае наступных людзей: І.В. Сталін, Г.К. Жукаў, А.М. Васілеўскі, Д. Эйзенхаўэр, Б. Мантгомеры, Л.І. Брэжнеў (усяго 17 чалавек)?

11. Якія краіны Еўропы і Азіі (цалкам ці часткова) былі вызвалены войскамі СССР падчас Вялікай Айчыннай вайны ад нямецкіх і японскіх захопнікаў?

12. Узброеныя фарміраванні якіх народаў у складзе вермахта прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне супраць СССР?

13. За здароўе якога народа ўздымаў тост І.В. Сталін на прыёме ў Крамлі ў гонар галоўнакамандуючых Чырвонай арміі ў чэрвені 1945 г.?

14. Як планавала кіраўніцтва Германіі падзяліць захопленую савецкую тэрыторыю пасля завяршэння бліцкрыгу?

ПРАЦУ ЗНОЙДЗЕ КАДРАВАЕ АГЕНЦТВА

"Кадравае агенцтва" БДУ 14 красавіка правядзе сустрэчу з прадстаўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый па пытанні сучаснага падыходу ў арганізацыі далейшага працаўладкавання выпускнікоў БДУ. Мерапрыемства арганізуецца разам з Мінскім гарадскім цэнтрам занятасці і пры падтрымцы газеты "Работа сегодня". Сустрэча адбудзецца ў актавай зале гістарычнага факультэта ў 10.00 (вул. Чырвонаармейская, 6, 3-і паверх). У мерапрыемстве возьмуць удзел прадстаўнікі ўсіх дэканатаў БДУ.

Удзельнікі азнаёмяцца з праграмамі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, падрыхтаваных Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы, комплексамі тэстаў псіхалагічных асаблівасцяў і прафпрыдатнасці, распрацаваных Рэспубліканскім інстытутам праблем чалавека, спісамі спецыяльнасцяў і навучальнымі праграмамі. Тут можна будзе таксама аформіць заяўкі на працаўладкаванне.

Падрабязную інфармацыю можна даведацца ў арганізатараў сустрэчы — у Мінскім гарадскім цэнтры занятасці (288-14-34), у "Кадравым агенцтве" БДУ (293-10-89, e-mail: filial_bsu@bsu.by).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

З УСМЕШКАЙ

***

Учора студэнт Пятроў абараніў свой дыплом ад хуліганаў, якія на яго напалі.

***

Напярэдадні абароны курсавога праекта студэнт Даніла Сланоў сустрэў студэнта Бегемотава і, як заведзена ў студэнтаў, спытаўся:

— Ну, як там твая курсавая?

— Пачаў рабіць, — уздыхнуў Бегемотаў.

— Так позна?

— Чаму гэта позна? — шчыра пакрыўдзіўся Бегемотаў. — Цяпер толькі 7 гадзінаў вечара!

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

13 красавіка 2006 года
Падпісана да друку 12.04.2006 г.
Зак. 350. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by